преподаватели Коган, Яковенко, Васильева и библиотекарь Преображенский, а преподаватели Ивашин, Танжунский и Фелицын – наказаны [2, л. 111]. Итогом проверок техникума стало назначение нового директора. Им стал Ахрамович, который до этого работал директором горбольницы. Новую волну политических нападок на коллектив медполитехникума вызвало убийство С.М. Кирова [5, л. 16–18 об., 41–46 об., 732]. Проблема с преподавательским составом могилевских медицинских учебных учреждений с точки зрения партийных властей так и не была решена вплоть до войны. В 1937/1938 учебном году на 1200 студентов приходилось от 8 до 10 штатных преподавателей. Остальные – «врачи больницы и врачи других лечебных учреждений, не педагоги, при чем около 50% из них люди, подвергшиеся репрессиям, высылки за антисоветские действия». Такая характеристика дана педколлективу Могилевского медтехникума в советских документах [6, л. 8].

Накануне войны открыли и отделение по подготовке военных фельдшеров. Качественный состав абитуриентов значительно вырос. Так, из 72 человек, поступивших на учебу в 1939 году все 72 первокурсника были выпускниками школ-десятилеток или рабфаков. 1939 году в Могилевской области к Могилевским фельдшерско-акушерской, фармацевтической школам и школе медсестер, Бобруйской фельдшерской школе добавили еще семь школ медсестер: Бобруйскую, Быховскую, Горецкую, Климовичскую, Осиповичскую, Шкловскую и Чаусскую. Всего в 1939/1940 учебном году в списке учебных заведений Могилевской области учтено 25 учреждений ССО и 9 (36%) из них – медицинские. Возможно, в этом списке показаны созданные под покровительством Белорусского общества Красного Креста так называемые курсы по подготовке медицинских сестер запаса [7, л. 32].

Некоторые сведения по учебным заведениям Могилевской области на 26 января 1940 года представлены в таблице [7, л. 32].

| Учебное заведение | Сколько поступило взносов за обучение | | | Сколько студентов-стипендиатов | | Сколько принято вновь | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Всего студентов | Сумма | % к общему числу студентов | Всего студентов | % к общему числу студентов | Всего | Из 10-леток и рабфаков |
| Могилевский медтехникум | - | - | - | 336 | 30 | 72 | 72 |
| Могилевская школа м/с | 6 | 450 | 2 | нет | Нет | Не поступило | |
| Горецкая школа м/с | 4 | 300 | 1,8 | 148 | 71 | 23 | - |
| Климовичская школа м/с | 70 | 5250 | 25 | 219 | … | - | - |
| Шкловская школа м/с | 194 | … | 100 | 25 | 18 | 11 | - |
| Бобруйская фельдшерская школа | 5 | 375 | 6 | 181 | 27 | 44 | 44 |
| Чаусская школа м/с | Сведений нет | | | | | | |
| Быховская школа м/с | Сведений нет | | | | | | |
| Бобруйская школа м/с | Сведений нет | | | | | | |

Таким образом, в 1930-е годы подготовка среднего медицинского персонала на Могилевщине велась активно, постоянно совершенствуясь и расширяясь. Это позволило подготовить необходимое число специалистов накануне войны. В докладе на Второй сессии Могилевского областного совета говорилось, что в области работает 66 больниц с 3852 койками в них, детские ясли на 3626 человек и 176 амбулаторий и поликлиник. Только за 1940 год число медицинских работников увеличилось на 50 врачей, 120 фельдшеров, 70 акушерок и 300 медсестер.

**Список использованной литературы**


1. Заремский, В. К. Могилевский медицинский колледж: история через века / В. К. Заремский. – Могилев : АмелияПринт, 2021. – 196 с.
2. ГАООМог. Ф. 6577. Оп. 1. Д. 835.
3. ГАМог. Ф. 380. Оп. 1. Д. 1.
4. ГАООМог. Ф. 9. Оп. 104. Д. 4;
5. ГАООМог. Ф. 6580. Оп. 1. Д. 680.
6. ГАООМог. Ф. 1161. Оп. 1. Д. 1.
7. ГАООМог. Ф. 9. Оп. 4а. Д. 97.


УДК 947.6

## «КАРЭНІЗАЦЫЯ» 1920-х ГАДОЎ: СУТНАСЦЬ І ЗМЕСТ


*Каляда Іна Уладзіміраўна*
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)



У артыкуле разглядаюцца пытанні правядзення «карэнізацыі» – кірунку беларусізацыі, што праводзілася ў БССР у 1920-я гады. Галоўнай мэтай «карэнізацыі» было выпраўленне становішча, што склалася на пачатку 1920-х гадоў, – непрапарцыянальна нізкая доля беларусаў у партыйных, савецкіх, гаспадарчых органах улады і кіравання, што не адпавядала агульнай колькасці беларускага насельніцтва.


У гісторыю Беларусі 1920-я гады ўвайшлі як перыяд росквіту беларускай культуры і мовы, што звязана з правядзеннем беларусізацыі – палітыкі нацыянальна-культурнага адраджэння, праграма якой уключала перавод на беларускую мову справаводства партыйнага, дзяржаўнага, прафсаюзнага і кааператыўнага апаратаў, вылучэнне беларусаў на партыйную, савецкую, прафсаюзную і грамадскую работу (карэнізацыя), арганізацыю школ, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў з выкладаннем на беларускай мове, развіццё беларускай літаратуры, навукова-даследчай працы па ўсебаковым вывучэнні Беларусі, пашырэнне беларускага друку і інш. За адраджэнне сваёй мовы і культуры ўзяліся як беларуская інтэлігенцыя, так і кіраўнікі рэспублікі. Мова народа стала дзяржаўнай не ў дэкларацыях, а ў самім жыцці.

Афіцыйны статус дзяржаўнай палітыкі беларусізацыя атрымала з прыняццем на ІІ сесіі ЦВК БССР (ліпень 1924 г.) пастановы «Аб практычных мерапрыемствах па правядзенні нацыянальнай палітыкі» [4, с. 7–9] і рэзалюцыі пленуму ЦК КП(б)Б (ліпень 1924 г.) «Аб праграме работ па правядзенні нацыянальнай палітыкі партыі ў Беларусі» [4, с. 115–120]. З гэтага часу праграма беларусізацыі набыла сілу закона. Шэраг пунктаў гэтых пастаноў непасрэдна тычыўся карэнізацыі – «вылучэнне беларусаў на партыйную, савецкую, прафсаюзную і грамадскую работу» [4, с. 9].

Распрацоўку і правядзенне нацыянальнай палітыкі ўскладняла непрапарцыянальна нізкая доля беларусаў у партыйных, савецкіх, гаспадарчых органах улады і кіравання. Беларусізацыя пачыналася тады, калі гэтая доля не дасягала і паловы. Так, у партыйных органах, ***якія*** вызначалі палітыку на ўсіх узроўнях, суадносіны былі такія: з 13 членаў ЦБ КП(б)Б у 1922 годзе беларусаў было 5, яўрэяў – 6, іншых – 2; з 74 членаў павятовых камітэтаў партыі – 31 (41,8%) былі беларусы, 34 (45,9%) – яўрэі, 9 (12,1%) – іншыя нацыянальнасці [2, с. 73].

Не лепшае становішча назіралася і ў дзяржаўных органах. Так, з 50 членаў ЦВК БССР ІІІ склікання (снежань 1921 г.) беларусаў было 19 (38%), яўрэяў – 17 (34%), рускіх – 3 (6%), украінцаў – 1 (2%), палякаў – 6 (12%), літоўцаў – 2 (4%), латышоў – 2 (4%). Толькі ў павятовых і сельскіх Саветах пераважалі беларусы. На 1 жніўня 1922 года з 101 члена павятовых выканкамаў беларусаў было 77 (76,2%), рускіх – 5 (4,9%), яўрэяў – 18 (17,8%), іншых – 4 (3,9%) [2, с. 73].

Назіралася становішча, калі беларусы – большасць насельніцтва рэспублікі – засталіся ў відавочнай меншасці ў партыйным і дзяржаўным апараце. Зразумела, што падобная з'ява не садзейнічала нармальнаму развіццю нацыянальных адносін і мела ў далейшым самыя негатыўныя вынікі.

Такія суадносіны ў кіруючых органах тлумачацца, у першую чаргу, тым, што яўрэі і рускія, якія пражывалі ў асноўным у гарадах і мястэчках, нават і да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года мелі больш магчымасцей атрымліваць добрую адукацыю. Невыпадкова па перапісе 1926 года самая значная колькасць пісьменных сярод розных нацыянальнасцей на Беларусі была ў яўрэяў – 70%, трохі менш у палякаў і рускіх – 50 і 49 адпаведна, у беларусаў – 36% [3, с. 60–61].

На працягу 1924–1925 гадоў распрацоўка праграмы беларусізацыі ў цэлым была завершана (на кадравае пытанне была звернута асаблівая ўвага). Гэта палітыка складалася з дзвюх узаемазалежных частак – нацыяналізацыі і карэнізацыі. Першая азначала шырокае развіццё беларускай культуры (школы, ВНУ на беларускай мове, выданне кніг, навукова-даследчая ра-

бота па ўсебаковым вывучэнні Беларусі і г.д.), увядзенне беларускай мовы практычна ў кожную галіну грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця (перавод на беларускую мову партыйнага, дзяржаўнага, прафесійнага, кааператыўнага апарата і часцей Чырвонай Арміі). Другая – вылучэнне прадстаўнікоў карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, прафсаюзную і грамадскую работу. Адзначым, што такое вылучэнне адбывалася не па нацыянальнай прыкмеце (беларус-не беларус), а па дзелавых якасцях, веданні ўмоў і асаблівасцей Беларусі, дасканальным валоданні беларускай і рускай мовамі. Адсюль і назва гэтага накірунку – карэнізацыя, якая датычылася не толькі беларусаў, але і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

Карэнізацыя, стаўшая адным з цэнтральных накірункаў беларусізацыі, прадугледжвала фарміраванне ў рэспубліцы кіруючага звяна з прадстаўнікоў усіх мясцовых карэнных нацыянальнасцей, што было адзначана ў рэзалюцыі студзеньскага пленума ЦК КП(б)Б, у справаздачах X з'езда КП(б)Б, а таксама ў пастанове бюро ЦК КП(б)Б «Аб нацыянальным складзе партыйных, прафесіянальных, савецкіх і іншых органаў», прынятай 27 жніўня 1927 года. Тут падкрэслівалася, што «вылучэнне беларусаў на адказную работу і ў далейшым застаецца галоўнай задачай у справе нацыяналізацыі партыйных, прафесіянальных, савецкіх і іншых устаноў» [1, с. 81]. Пры фарміраванні кіруючых кадраў прапаноўвалася ўлічваць у першую чаргу палітычную вытрыманасць вылучэнцаў, іх дзелавыя якасці, веданне беларускай мовы і ўмоў развіцця БССР. Пастанова прадпісвала павялічыць колькасць беларусаў у партыйных, прафсаюзных, мясцовых савецкіх органах, у складзе калегій наркаматаў, кіраванняў банкаў, маскоўскіх прадстаўніцтваў БССР і інш.

Карэнізацыя – складанае пытанне беларусізацыі, бо менавіта тут лягчэй за ўсё маглі ўзнікнуць узаемныя крыўды, непаразуменні з-за супрацьстаўлення інтарэсаў адной нацыянальнасці другой. Аднак і вырашаць яго трэба было неадкладна. Доля беларусаў у органах улады і кіравання была зусім невялікая адносна агульнай удзельнай вагі ў складзе насельніцтва. Такое становішча неабходна было мяняць, што з ростам адукаванасці і культурнага ўзроўню ўсё вастрэй усведамлялася шырокімі слаямі насельніцтва. Тым не менш яшчэ ў пачатку 1920-х гадоў, пры распрацоўцы нацыянальнай палітыкі, ставілася задача вылучэння прадстаўнікоў карэннага насельніцтва на тую ці іншую пасаду не па нацыянальнасці, а па дзелавых якасцях, веданні беларускай і рускай мовы, гісторыі Беларусі і г.д. У рэзалюцыі студзеньскага (1925 г.) пленума ЦК КП(б)Б спецыяльна агаворвалася: «Ставячы працу па вылучэнню беларускіх таварышаў, тым не менш не процістаўляць іх ніколі тым супрацоўнікам, не беларусам, якія вывучылі беларускую мову і мясцовыя ўмовы» [5, с. 68]. Тым не менш частка інтэлігенцыі нацыянальных меншасцей, якая бачыла ў гэтай справе толькі выдзяленне беларусаў на кіруючыя пасады, насцярожана аднеслася да гэтай палітыкі.

У 1924–1925 гадах у апараце цэнтральных органаў улады працэнт яўрэяў, рускіх і іншых у адносінах да беларускага насельніцтва з'яўляўся даволі-такі значным. Тлумачыцца гэта тым, што прадстаўнікі гэтых нацыянальнасцей жылі большай часткай у гарадах, а цэнтральныя апараты насычаліся, галоўным чынам, за кошт гарадскога насельніцтва. У мясцовых жа апаратах працэнт беларусаў з'яўляўся пераважным у адносінах да іншых нацыянальнасцей.

У 1929 годзе у выніку правядзення карэнізацыі становішча было такое: доля беларусаў у адміністрацыйных установах складала 51,3%, рускіх – 18, яўрэяў – 24,8, палякаў – 0,1, іншых – 5,8%. У цэнтральным савецкім апараце доля беларусаў складала 32,5%, рускіх – 24,2, яўрэяў – 36,8%. У гаспадарчых установах доля беларусаў раўнялася 30,8 %, рускіх – 13,1, яўрэяў – 49,3, палякаў – 1,1, іншых – 5,7%. Напрыклад, у апараце Вышэйшага Савета народнай гаспадаркі Беларусі сярод спецыялістаў-інжынераў беларусы складалі 26%, рускія – 12,2, яўрэі – 52, палякі – 1,6, іншыя – 3,1%. У судовых установах беларусаў налічвалася 26,3%, рускіх – 21,1, яўрэяў – 42,2, іншых – 11,5%; у зямельных органах беларусаў было 59,5%, рускіх – 24,1, яўрэяў – 10,1, іншых – 6,3% [3, с. 64].

Такім чынам, пераважны працэнт беларусаў назіраўся ў адміністрацыйных і зямельных органах, у гаспадарчых і судовых пераважны працэнт складалі яўрэі, што тлумачыцца гістарычным мінулым, большым культурным узроўнем, большай падрыхтоўкай **іх** у галіне спецыяльных ведаў – юрыдычных, эканамічных, гаспадарчых.

У канцы 1920-х гадоў у рэспубліцы пачынаецца паступовы адыход ад першапачатковага разумення беларусізацыі – нацыянальнае ўсё часцей стала свядома атаясамлівацца з нацыяналістычным. Адступленне ад прынцыпаў беларусізацыі знайшло адлюстраванне ў скарачэнні колькасці беларусаў у кіруючых органах, пераводзе дзейнасці школ, культурна-асветніцкіх устаноў з беларускай на рускую мову, змяншэнні тыражоў беларускамоўных выданняў і г.д. Пачалося адкрытае наступленне на нацыянальную інтэлігенцыю, якую ўсё часцей сталі абвінавачваць у прыхільнасці да «нацыянал-дэмакратызму», у імкненні «нацыянальныя інтарэсы ставіць вышэй за класавыя».

Нацыянальная самасвядомасць фарміруецца пад уплывам аб'ектыўных фактараў, што робіць надзвычай актуальным мэтанакіраваны ўплыў на яе, што, у сваю чаргу, спрыяе давядзенню гэтай самасвядомасці да ўзроўню, які забяспечваў бы поўную гарантыю ад культурнай асіміляцыі, знікнення як самастойнай нацыі. Асабліва важным тут з'яўляецца ўмелае выкарыстанне тых гістарычных традыцый і духоўных каштоўнасцей, якія назапашаны папярэднімі пакаленнямі, свядомае вяртанне народа да гістарычных каранёў, нацыянальных традыцый.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Аб нацыянальным складзе партыйных, прафесіянальных, савецкіх і іншых органаў: пастанова Бюро ЦК КП(б)Б, 27 жніўня 1927 г. // Беларусізацыя: 1920-я гады: Дакументы і матэрыялы / пад агульнай рэд. Р. Платонава і У. Коршука. – Мн. : БДУ, 2001. – 270 с.
2. Актуальныя пытанні гісторыі і культуры Беларусі (1917–1939 гг.) – Мн. : Выд-ва БДТУ, 1994. – Ч. III. – 122 с.
3. Два гады нацыянальнай работы ў БССР : збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальнаму пытанню. – Мн. : Выд-ва Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР, 1929. – 167 с.
4. Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў БССР. – Мн. : Выд-ва Нацкамісіі ЦВК БССР, 1928. – Ч. 1: Беларусізацыя. – 152 с.
5. Рэзалюцыя пленума ЦК КП(б)Б, 25-29 студзеня 1925 г. // Беларусізацыя: 1920-я гады : Дакументы і матэрыялы / пад агульнай рэд. Р. Платонава і У. Коршука. – Мн. : БДУ, 2001. – С. 58–69.


УДК 631.171-051:377.3(476-15)(091) «1940/1941»

# ПОДГОТОВКА МЕХАНИЗАТОРОВ В ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В 1940–1941 гг. : ОСОБЕННОСТИ, ЭТАПЫ, ИТОГИ


*Колос Андрей Васильевич*
аспирант-соискатель государственного научного учреждения «Институт истории Национальной академии наук Беларуси» (г. Минск, Республика Беларусь)


*В данной статье была предпринята попытка изучить особенности подготовки механизаторов в Западной Беларуси в 1940–1941 гг. На основе полученных данных установлено, что, несмотря на количественный рост сети специальных учебных заведений, до начала ВОВ не удалось решить проблему обеспечения учебных заведений необходимой материально-технической базой, которая отразилась на кадровой подготовке.*

**Введение.** Осенью 1939 г. произошло одно из значимых событий в отечественной истории – вхождение Западной Беларуси в состав БССР. Однако проведение социалистических преобразований в аграрном секторе отягчалось тем, что большинство крестьян не стремились вступать или организовывать колхозы. За годы проведения коллективизации в СССР партийные деятели пришли к заключению, что поставки тракторов не могли доказать преимущества совхозов и колхозов над единоличным сектором. Для этого необходимо было решить кадровую проблему и в первую очередь ликвидировать дефицит квалифицированных трактористов в совхозах, колхозах и МТС Западной Беларуси [1, с. 50].

**Стратегия правительственного курса.** В процессе решения задачи по ликвидации дефицита квалифицированных трактористов партийное руководство БССР исходило из директивных установок, принятых СНК и ЦК КП(б)Б 10 февраля 1940 г., в области обеспечения сельского хозяйства машинно-тракторной техникой. Этим же постановлением предусматривалась организация сети специализированных учебных заведений на